УДК 741+378.147.025.7

## Сістэма безперапыннага навучання як аснова якаснай адукацыі

Барбарчык М.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт.

С развіццём акадэмічнай школы патрабаванні к мэтам і задачам адукацыі набылі сістэмны характар. Сучасныя патрабаванні да адукацыі прадугледжваюць наяўнасць бесперапынных адукацыйных сістэм на аснове паступовага і мэтанакіраванага развіцця асобы ад дашкольнага ўзросту да прафесійнай дзейнасці. Пачатковай ступенью адукацыі з'яўляецца сярэдняя школа. У школе вучні спасцігаюць азы розных навук, што дае магчымасць ужо на першай стадыі навучання вызначыць стаўленне да будачай прафесійнай дзейнасці і пачаць паглыбленае вывучэнне цікавай для яго дысцыпліны. Ў адпаведнасці з мэтамі асноўнымі задачамі ў сярэдняй школе з'яўляецца:

- фарміраванне эстэтычнай культуры і духоўнага свету вучня;
- навучанне асновам прапануемых вучэбнай праграмай дысцыплін;
- развіццё здольнасцей успрымаць і правільна разумець асноўныя законы прыроды і соцыума;

Да сярэдняй ступені адносяцца вучэбныя установы, дазваляючыя атрымаць сярэдне-спецыяльную адукацыю (вучэльні, каледжы, ліцэі). Мэтай на гэтай ступені з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў для прафесій дзейнасцінай, а задачы навучання наступныя:

- набыццё спецыяльных ведаў,якія дазваляюць рэалізаваць іх ў галіне прафесійнай і агульна-культурнай дзейнасці;
- навучанне шляхам фарміравання цэластнай сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў па спецыяльных дысцыплінах;
- на аснове змястоўных і працэсуальных бакоў адукацыі фарміраванне якасцей асобы, неабходных для прафесійнай дзейнасці.

І нарэшце апошняй прыступкай, якая завяршае прафесійную адукацыю, з'яўляецца вышэйшая адукацыя. Ў структуры патрабаванняў вышэйшай адукацыі наступныя асноўныя мэты і задачы:

- на аснове пераемнасці адукацыйнага працэсу падрыхтоўка высокакласных спецыялістаў для прафесійнай, педагагічнай і навуковай дзейнасці;
- на аснове высокага ўзроўню патрабаванняў набыццё ведаў па спецыяльных прадметах;
- набыццё ведаў на аснове ўзмацнення сувязей навукова-тэарэтычнай і практычнай дзейнасці студэнтаў;
-на аснове адпаведных умоў магчымасць праяўленне навучэнцамі самастойнасці, самарэалізаціі і самасцвярджэння.